Источник: "Беларуская думка" - № 7, 2012-07-19



# Янка Купала – наш гонар і боль…

Можна зрабіць назіранне, што жыццё Янкі Купалы, яго дзейнасць, асабліва літаратурная творчасць, непасрэдна звязаны, нават знітаваны з тымі грамадска-палітычнымі абставінамі, якія існавалі на Беларусі ў розныя перыяды яе развіцця. Пры гэтым характэрна, што такая залежнасць нават нарастала, па меры таго як ускладняліся палітычныя і сацыяльныя абставіны ва ўмовах савецкай рэчаіснасці і павышалася папулярнасць і вядомасць паэта.

Пачатак творчага станаўлення Я. Купалы быў у першую чаргу звязаны з супрацоўніцтвам у газеце «Наша Ніва» і яе рэдагаваннем. Гэтыя і некаторыя наступныя гады ўяўляюць сабою ў многіх праявах рамантычны этап яго жыцця, аб чым сведчаць акалічнасці, звязаныя з напісаннем рамантычных паэм і, магчыма, у першую чаргу, са стварэннем п'есы «Паўлінка». Як вядома, яе назва супадае з імем першай выканальніцы гэтай ролі – Паўліны Мядзёлкі. Свае ўзаемаадносіны з дзяўчынай, а таксама некаторыя рысы яе характару аўтар п'есы перанёс у літарататурны твор. Рамантычнае супрацоўніцтва пэўным чынам адлюстравана ў кнізе П. Мядзёлкі «Сцежкамі жыцця». Гэтыя «сцежкі» пры яе выданні былі значна пачышчаны савецкімі цэнзарамі, таму да нас не дайшлі многія факты з жыцця Я. Купалы тых часоў. А шкада, таму што гэта абядняе ў нашым уяўленні воблік паэта і пачынаючага драматурга ў яго маладыя гады.

Пасля складаных перыпетый у перыяд Першай сусветнай вайны і пачатковых гадоў савецкай улады ўздзеянне грамадска-палітычных абставін на жыццё і творчасць Я. Купалы не толькі не зменшылася, а нават пачало ўзмацняцца. Гэта характэрна і для сярэдзіны 1920-х гадоў, калі ва ўмовах дзеяння новай эканамічнай палітыкі і ажыццяўлення беларусізацыі духоўна-культурнае, у тым ліку і літаратурнае, жыццё ў Беларускай ССР віравала. Ствараліся новыя літаратурныя аб'яднанні, актыўна ўключаліся ў творчую дзейнасць не толькі сталыя, але і многія маладыя паэты і пісьменнікі.



Фотаздымак Я. Купалы з аўтографам

І тым не менш, у 1926 годзе была першы раз забаронена пастаноўка купалаўскай п'есы «Тутэйшыя». Канешне, яна мела пэўную грамадска-бытавую вастрыню, але менавіта дзякуючы выдатнаму таленту яе аўтара ўдалося надзвычай яскрава і рэльефна адлюстраваць становішча беларускага народа, які пачуваў сябе паміж рускім і польскім. Дарэчы, у наступныя дзесяцігоддзі, нават пасляваенныя, гэты сюжэт неаднаразова па-мастацку знаходзіў адлюстраванне і ў вершах, і ў напісаных на іх аснове песнях. А ў той час, калі п'еса з'явілася, яна была даволі хутка забаронена, нягледзячы на пэўны лібералізм у грамадска-палітычным і культурным жыцці. Можна ўявіць, як гэта паўплывала на аўтара!

Між тым, павышаная ўвага да паэта з боку ідэалагічных органаў і ў першую чаргу Галоўліта была звязана з пачаткам барацьбы партыйна-дзяржаўных структур з так званым беларускім нацыянал-дэмакратызмам. Ініцыятарам гэтай барацьбы ў рэспубліцы стаў тагачасны першы сакратар ЦК КП(б)Б А. Крыніцкі. Толькі на працягу 1925 года ён двойчы, выступаючы на сходзе Мінскай га-


Aznajmujecca tymto listam što u teatralnaj zali Von-Derwiza (W. D. Sredni pr. № 48).

*u subotu 9-ho lutaho (fiewrala) 1913 h.*

ZHULAJECCA

**BIEŁARUSKAJE IHRYŠČE**

Ładženaje artystam K. A. Drozdowym.

Na ihryščy budzie piejać Biełaruski chor wiedzieny J. Kiełpšam.

i predstaŭlena budzie pa biełarusku

**PAŬLINKA**

scena s šlachockaho žyćcia u 2-ch dziejach Janki Kupały

Doklamacija biełaruskaja.

Oryginalnyje biełaruskije wopratki.

**Biełaruskije tancy.**

Pasla predstaŭleńnia **tancy** pad arkiestr da 3-ch hadzin nočy.

**Počta, Kioski, Konfetti.**

Pačatak w 8½ hadzin.

Za adziežu płacić šwejcaru 10 kap.

Bilety ad 3 r. 10 kop. da 50 kop. pracajucca u W. Jwanoŭskaho—Sierpuchowskaja 31, kw. 10 u W. Epimach-Šypiłło—Sadowaja № 12, kw. 34 i u dzień ihryšča u kasi sali Von-Derwiz.

Uchod na tancy 1 rubiel.

Афіша спектакля «Паўлінка»

радской партыйнай арганізацыі, настойліва засяроджваў увагу на неабходнасці весці барацьбу з гэтай, як ён казаў, заганнай з'явай беларускай савецкай рэчаіснасці.

Дарэчы, праблемы з цэнзурай у Янкі Купалы здараліся неаднойчы. Вядома, у прыватнасці, як непрыхільна былі сустрэты ва ўладных структурах яго верш «Перад будучыняй», а таксама некаторыя іншыя творы. У той жа час даводзілася яму ствараць літаратурныя творы і на заказ. Напрыклад, «Над ракой Арэсай» і інш.

Складаным праяўленнем знітаванасці яго жыцця і творчасці з грамадска-палітычнымі абставінамі з'явіліся падзеі канца 1920-х – пачатку 1930-х гадоў, калі ў БССР была разгорнута «актыўная і бескампрамісная» барацьба з так званым «Саюзам вызвалення Беларусі», які, як цяпер вядома, ніколі не існаваў, а справа аб ім была сфабрыкавана. Паэту прыпісвалася адна з вядучых роляў у гэтай міфічнай арганізацыі. Пад уздзеяннем допытаў ён зрабіў замах на сваё жыццё. На шчасце, усё абышлося, аднак гэты факт, несумненна, сведчыць пра многае. Нездарма паведамленні аб спробе самагубства Я. Купалы ішлі ў Маскву на ўзроўні вышэйшых асобаў.

Працуючы з матэрыяламі архіваў, у прыватнасці з пратаколамі пасяджэнняў Палітбюро ЦК УКП(б), якія цяпер захоўваюцца ў Расійскай Федэрацыі, я звярнуў увагу, што на працягу 1930-х гадоў прозвішча Янкі Купалы там не сустракаецца.

Канешне, у апошнія дзесяцігоддзі беларускія гісторыкі, літаратары, наогул гуманітарыі, многія іншыя зацікаўленыя людзі актыўна аналізуюць абставіны, што прывялі да трагічнай гібелі Янкі Купалы. Больш за ўсё звяртаюць увагу на тое, што не адбывалася аніякай падрыхтоўкі да 60-гадовага юбілею літаратурнага класіка, да якога заставалася не болей як дзесяць дзён. Але дажыць да гэтай даты Я. Купалу не было суджана.

Юбілей з часу нараджэння нашага песняра і прарока, а таксама круглая дата, як яго не стала, заўсёды будуць ісці побач. І гэта ў нейкім сэнсе сімвалічна... Ва ўсялякім разе, Янка Купала – гэта назаўсёды не толькі наш гонар, наша годнасць, але і наш боль, калі мець на ўвазе яго трагічную гібель. Асобы ж такога ўзроўню жывуць, пакуль жыве народ, які яны ўслаўлялі і ў які так верылі.

**Міхаіл КАСЦЮК, акадэмік НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар**


Аўтограф Я. Купалы